Голас душы

Яднанне ў любові

№ 10 (535)

Субота, 12 лістапада 2016 г.

Штотыднёвы хрысціянскі бюлетэнь

# «НАШЫ МАЛІТВЫ АДМЫКАЮЦЬ ПАМЕРЛЫМ БОЖАЕ ВАЛАДАРСТВА»

*Кожны чалавек можа стаць святым, калі жыве паводле Божога закону, аднак гэта не так проста, бо чалавечая прырода дэфармавана першародным грахом і схільная да граху. Пра гэта нагадаў Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч 1 лістапада 2016 г. падчас літургіі ў мінскай архікатэдры.*




1 лістапада, урачыстасць Усіх Святых, – гэта дзень, у які Касцёл успамінае ўсіх святых – кананізаваных і некананізаваных.

«Кожны дзень мы ўспамінаем таго ці іншага святога. Гэта тыя людзі, якія адзначыліся святасцю свайго жыцця і такімі былі прызнаныя Касцёлам. Сярод іх – духоўныя і свецкія асобы, маладыя і ва ўзросце, сужэнцы, мучанікі і вызнаўцы, – сказаў арцыпастыр. – Сярод іх ёсць і такія, якія адзначыліся святасцю свайго жыцця і, можа, нават пралілі кроў за веру, аднак у многіх выпадках працэс іх праслаўлення не вёўся і не вядзецца. Яны не аб'яўленыя Касцёлам святымі, але ў Божых вачах такімі з'яўляюцца».

Дзякуючы нашым малітвам і асабліва адпустам, як падкрэсліў іерарх, колькасць святых павялічваецца. «Гэта знак нашай удзячнасці нашым бацькам, братам, сёстрам, блізкім. Гэта знак салідарнасці з тымі, якія чакаюць і не могуць дачакацца, каб перайсці ў краіну вечнага шчасця. Гэта таксама знак праяўлення міласэрнасці да іх, аб чым мы павінны асаблівым чынам памятаць у Юбілейны Год Божай Міласэрнасці», – дадаў Мітрапаліт Кандрусевіч.

Арцыпастыр заклікаў прысутных маліцца за памерлых, каб такім чынам скараціць час іх прабывання ў чыстцы: «Споведзь, святая Камунія, наведванне могілак і малітва ў інтэнцыях Святога Айца стануць тым ключом, які адчыніць ім дзверы ў краіну вечнага шчасця. Не забудзем пра нашых памерлых, якія перадалі нам

*Працяг на стар. 2*

# «НАШЫ МАЛІТВЫ АДМЫКАЮЦЬ ПАМЕРЛЫМ БОЖАЕ ВАЛАДАРСТВА»

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 1*

Божы дар жыцця, клапаціліся пра нашае фізічнае, інтэлектуальнае і духоўнае выхаванне і пакінулі нам прыклад веры, каб за іх старанні на зямлі міласэрны Бог адудзячыў ім вечным шчасцем у сваім Валадарстве».

Пасля святой Імшы адбылася традыцыйная жалобная працэсія. На паасобных стацыях ардынарый Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі разам са святарамі і вернікамі маліўся за памерлых біскупаў, святароў, кансэкраваных асобаў, бацькоў, блізкіх, загінулых у войнах і з прычыны тэрарыстычных актаў, а таксама за ўсіх памерлых.

*Паводле Catholic.by*




# УРАЧЫСТАСЦЬ УСІХ СВЯТЫХ

1 лістапада Каталіцкі Касцёл адзначае ўрачыстасць Усіх Святых. У гэты дзень вернікі дзякуюць Богу за дар святасці і ў адной літургічнай цэлебрацыі аддаюць пашану ўсім святым – як вядомым, так і невядомым, – якія дасягнулі вечнай хвалы і прабываюць з Богам у небе.

Наступны дзень, 2 лістапада, прысвечаны ўспаміну ўсіх памерлых вернікаў. Згодна з традыцыяй, у гэты дзень прынята наведваць могілкі і асаблівым чынам маліцца за памерлых.

На працягу актавы Успаміну ўсіх памерлых вернікаў, гэта значыць з 1 па 8 лістапада, Касцёл будзе асаблівым чынам маліцца за памерлых. У гэты час Касцёл дае нам магчымасць атрымаць поўны адпуст – поўнае адпушчэнне кары за грахі, – які можна ахвяраваць за душы памерлых. Для атрымання адпусту неабходна быць у стане асвячальнай ласкі (г. зн. прыступіць да сакрамэнту пакаяння і паяднання – спаведзі), прыняць святую Камунію, памаліцца ў інтэнцыях Святога Айца і наведаць могілкі. Больш падрабязную інфармацыю пра адпусты можна атрымаць у святароў або знайсці ў малітоўніку «Ойча наш» (1-е выданне – с. 331; 2-е выданне – с. 343).

Усе каталікі павінны паклапаціцца пра тое, каб перад святамі прыбраць магілы сваіх родных і блізкіх, а таксама занядбаныя магілы паблізу. Згодна з хрысціянскай традыцыяй недапушчальна прыносіць і спажываць на могілках ежу і спіртныя напоі, а таксама класці іх на магілы. Годным успамінам пра памерлых з'яўляецца запаленая на магіле свечка (або зніч) і кветкі, але перш за ўсё – малітва за супакой душы.

*Паводле Catholic.by*

# БОЖАЕ СЛОВА АДКРЫВАЕ СЭРЦА ЧАЛАВЕКА НА ГОЛАС КЛІЧУЧАГА ПАНА

*З 19 па 21 кастрычніка 2016 г. у Рыме праходзіў кангрэс, прысвечаны душпастырству пакліканняў. У форуме, арганізаваным Кангрэгацыяй па справах духавенства, прымаў удзел і дапаможны біскуп Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Аляксандр Яшэўскі SDB*

На кангрэсе беларускі іерарх выступіў з дакладам на тэму «Заданні пастыраў у галіне пакліканняў». У дакладзе падкрэслівалася, што першым адказным за развіццё пакліканняў з'яўляецца біскуп. Праз малітву – «асноўную прыладу» ў гэтай галіне служэння – біскуп просіць Бога паслаць працаўнікоў на сваё жніво. «Наступным элементам з'яўляецца абвяшчэнне Божага слова, якое мае моц змяняць сэрца чалавека і чыніць яго здольным чуць голас Пана, які кліча», – падкрэсліў біскуп Яшэўскі.

«Месцам, у якім працягваецца развіццё паклікання, з'яўляецца семінарыя, і біскуп павінен прысутнічаць у яе жыцці праз частыя візітацыі, асабістыя размовы з семінарыстамі, выкладчыкамі і фарматарамі. Семінарыя, як вучыць папа Францішак, павінна стаць супольнасцю, дзе існуе праўдзівы дыялог, адзінства, адкрытасць і гатоўнасць выхавацеляў слухаць і накіроўваць па-бацькоўску. Таму выкладчыкі і фарматары павінны развіваць у сабе дух айцоўскага, а не аўтарытарнага выхавання. Бо першая пастава спрыяе развіццю будучага святара, а другая – замыкае і не дазваляе ўзрастаць у правільным кірунку святарскага паклікання», – дадаў біскуп Яшэўскі.

У ходзе выступлення беларускі іерарх распавёў пра пастырскія сустрэчы ва ўсіх дыяцэзіях Беларусі і назваў іх важным момантам у пастаяннай фармацыі ўсяго духавенства лакальнага Касцёла. Таксама біскуп нагадаў пра чатыры вымярэнні, у якіх адбываецца фармацыя як будучага святара, так і ўсяго духавенства: чалавечае, духоўнае, інтэлектуальнае і пастаральнае.

Другая частка даклада датычыла ролі святароў у душпастырстве пакліканняў. Біскуп акцэнтаваў увагу прысутных на такім моцным фактары як асабістае сведчанне святароў.

«Важнай задачай святароў з'яўляецца таксама вучыць сем'і жыць з верай. Выйшаўшы з крызісу сям'і, будзе пераадолены і крызіс пакліканняў, – падкрэсліў іерарх. – Нельга таксама забываць пра катэхізацыю і выхаванне моладзі. Варта смела прапаноўваць ім прысвячаць сваё жыццё Богу».

На заканчэнне беларускі іерарх адзначыў: «Не мае значэння, колькі нас будзе. Важна тое, што мы ведаем, якімі мы павінны быць, і ўжо цяпер да гэтага ідэалу імкнуцца і набліжацца».






21 кастрычніка біскуп Аляксандр Яшэўскі разам з іншымі ўдзельнікамі міжнароднай канферэнцыі прыняў удзел у аўдыенцыі са Святым Айцом.

*Паводле Catholic.by*

# РАСКЛАД ПЕРЭГРЫНАЦЫІ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ ФАЦІМСКАЙ ПА ПАРАФІЯХ МІНСКА-МАГІЛЁЎСКАЙ АРХІДЫЯЦЭЗІІ

*На працягу дзевяці месяцаў у парафіях Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі будзе адбывацца перэгрынацыя фігуры Маці Божай Фацімскай. Прапануем азнаёміцца з раскладам перэгрынацыі па дэканатах архідыяцэзіі*

**13.10–16.10.2016 – мінская архікатэдра Імя Найсвяцейшай Панны Марыі** (адказны – кс. Антоні Клімантовіч)

**16.10–19.11.2016 – Магілёўскі дэканат** (адказны – кс. Віталій Драздоўскі)

*16–18 кастрычніка*

18.30 – Магілёў, парафія Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і Св. Станіслава

*18–21 кастрычніка*

18.00 – Магілёў, парафія Св. Антонія

*21–23 кастрычніка*

18.00 – Магілёў, парафія Св. Казіміра і Св. Ядзвігі

*23–26 кастрычніка*

12.00 – Шклоў, Фашчаўка, Княжыцы

*26 кастрычніка*

18.00 – Горкі, парафія Маці Божай Бялыніцкай

*27 кастрычніка*

18.00 – Мсціслаў, парафія Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі

*28–30 кастрычніка*

18.00 – Крычаў, парафія Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі

*30 кастрычніка–3 лістапада*

11.00 – Касцюковічы, парафія Святой Тройцы

*3–5 лістапада*

10.00 – Чавусы, парафія Найсвяцейшай Панны Марыі Маці Касцёла

**5.11–19.11.2016 – Бабруйскі дэканат** (адказны – кс. Андрэй Яркавец)

*5–2 лістапада*

17.45 – Бабруйск, касцёл Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі

*6 лістапада*

Клічаў, капліца Маці Божай Фацімскай

*12 лістапада*

14.00 – Глуск, капліца Святой Ганны

*12–19 лістапада*

17.45 – Асіповічы, касцёл Божай Міласэрнасці

**19.11–17.12.2016 – Барысаўскі дэканат** (адказны – кс. Аляксей Раманчук)

– Багушэвічы – Божага Цела

– Барысаў – Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі

– Барысаў – Спаслання Духа Святога

– Беразіно – Маці Божай Міласэрнасці

– Жодзіна – Маці Божай Фацімскай

– Зембін – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі

– Крупкі – Св. Юзафа

– Мар'іна Горка – Св. Антонія

– Рудзенск – Св. апосталаў Пятра і Паўла

– Смалявічы – Св. Валянціна

– Смілавічы – Маці Божай Нястомнай Дапамогі і Св. Аляксандра

– Суцін – Маці Божай Шкаплернай

– Халопенічы – Сэрца Марыі і Св. Язафата

– Чэрвень (Ігумен) – Узвышэння Святога Крыжа

**17.12.2016–14.01.2017 – дэканат Мінск-Усход** (адказны – кс. Ян Крэміс)

*17–24 снежня*

18.30 – Мінск – Божага Цела

– Сініло – Маці Божай Зоркі Евангелізацыі

– Мінск (Шабаны) – Хрыста Збаўцы

– Мінск (Грэка-католікі) – Св. Юзафа

– Мінск (Грэка-католікі) – Св. Мікалая

*24–31 снежня*

18.30 – Мінск (Лошыца) – Маці Божай Ружанцовай

– Гатава – Св. Міхала Арханёла

– Каралішчавічы – Св. Станіслава Мучаніка

*31 снежня–6 студзеня*

18.30 – Мінск (Серабранка) – Св. Яна Хрысціцеля

– Мінск (Чыжоўка) – Святога Духа

*6–10 студзеня*

18.30 – Бараўляны – Найсвяцейшай Панны Марыі Успамогі Хрысціянаў

– Раўбічы – парафія Св. Мацвея

*10–14 студзеня*

18.30 – Мінск (Сокал) – Маці Божай Ларэтанскай

– Мінск (Уручча) – Св. Францішка Асізскага

– Мінск (Уручча) – Св. Андрэя Апостала

**14.01–11.02.2017 – дэканат Мінск-Захад** (адказны – кс. Уладыслаў Завальнюк)

*14–17 студзеня*

18.30 – Заслаўе – Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі

*17–20 студзеня*

18.30 – Ждановічы – Багародзіцы Апякункі сем'яў

*Працяг на стар. 5*

# РАСКЛАД ПЕРЭГРЫНАЦЫІ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ ФАЦІМСКАЙ ПА ПАРАФІЯХ МІНСКА-МАГІЛЁЎСКАЙ АРХІДЫЯЦЭЗІІ

*Працяг. Пачатак на стар. 4*

*20–23 студзеня*
18.30 – Мінск (Каменная Горка) – Маці Божай Будслаўскай
*23–26 студзеня*
18.30 – Мінск (Кунцаўшчына) – Св. Яна Евангеліста
*26–29 студзеня*
18.30 – Мінск (Сухарава) – Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі
*29 студзеня–01 лютага*
18.30 – Мінск (Кальварыя) – Узвышэння Святога Крыжа
– Мінск (Грэка-каталікі) – Маці Божай Нястомнай дапамогі
*01–03 лютага*
18.30 – Мінск – Св. Апосталаў Пятра і Паўла і Св. Яўгена
*03–11 лютага*
18.30 – Мінск – Св. Сымона і Св. Алены
– Мінск (Малінаўка) – Св. Антонія
– Мінск – Св. Яна Паўла II

**11.02–04.03.2017 – Нясвіжскі дэканат** (адказны – кс. Пётр Шарко)
– Вынішча – Нараджэння Св. Яна Хрысціцеля
– Гарадзея – Св. Юзафа
– Замосце – Св. Барбары
– Капыль – свв. апосталаў Пятра і Паўла
– Клецк – Святой Тройцы
– Ленькі – Св. Ганны
– Любань – Маці Божай Фацімскай
– Нагорнае – Узвышэння Святога Крыжа
– Нясвіж – Божага Цела
– Салігорск – Св. Францішка
– Сейлавічы – Найсвяцейшага Сэрца Езуса
– Слуцк – св. Антонія
– Сноў – Св. Яна Хрысціцеля
– Старыя Дарогі – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі

**04.03.2017–25.03.2017 – Стаўбцоўскі дэканат** (Адказны – кс. Уладзімір Каспарэвіч)
– Волма – Св. Яна Хрысціцеля
– Дзераўная – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі
– Дзяржынск – Св. Ганны
– Налібокі – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі
– Новы Свержань – свв. Пятра і Паўла
– Рубяжэвічы – Св. Юзафа
– Стоўбцы – Св. Казіміра
– Узда – Узвышэння Святога Крыжа
– Фаніпаль – Найсвяцейшага Сэрца Езуса і Марыі
– Хатава – Найсвяцейшага Сэрца Езуса
– Негарэлае – Перамянення Пана

**25.03–22.04.2017 – Валожынскі дэканат** (адказны – кс. Дзмітрый Барыла)
– Багданава – Св. Міхала Арханёла
– Валожын – Св. Юзафа
– Вішнева – Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі
– Забрэззе – Найсвяцейшай Тройцы
– Івянец – Св. Міхала Арханёла
– Івянец – Св. Аляксея
– Камень – Свв. Пятра і Паўла
– Пяршаі – Св. Юрыя
– Ракаў – Найсвяцейшай Панны Марыі Ружанцовай

**22.04–13.05.2017 – Маладзечанскі дэканат** (адказны – кс. Эдмунд Даўгіловіч-Навіцкі)
– Беніца (Маркава) – Святой Тройцы
– Беразінскае – Божага Цела
– Краснае – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі
– Лебедзева – Найсвяцейшага Сэрца Езуса
– Маладзечна – Св. Казіміра
– Маладзечна – Св. Юзафа
– Палачаны – Св. Роха
– Радашковічы – Святой Тройцы

**13.05–03.06.2017 – Вілейскі дэканат** (адказны – кс. Аляксандр Барыла)
– Аколава – Св. Міхала Арханёла
– Акцябр (Хатаевічы) – Св. Дамініка
– Акцябрскі – Святой Тройцы і Св. Крыштафа

**27.05–28.05.2017 Мінск (Залатая Горка) – працэсія Божага Цела** (адказны – кс. Юрый Санько)
– Альковічы – Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі
– Вілейка – Узвышэння Сятога Крыжа
– Вязынь – Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі
– Даўгінава – Св. Станіслава
– Касцяневічы – Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі
– Корань – Св. Антонія

*Працяг на стар. 6*

# РАСКЛАД ПЕРЭГРЫНАЦЫІ ФІГУРЫ МАЦІ БОЖАЙ ФАЦІМСКАЙ ПА ПАРАФІЯХ МІНСКА-МАГІЛЁЎСКАЙ АРХІДЫЯЦЭЗІІ

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 4-5*

– Куранец – Найсвяцейшай Панны Марыі Маці Касцёла
– Ілля – Найсвяцейшага Сэрца Езуса
– Лагойск – святога Казіміра
– Любань (Вілейскі р-н) – Божай Міласэрнасці
– Лукавец (Батурына) – Свв. Пятра і Паўла
– Нарач (Вілейскі р-н) – Маці Божай Анёльскай і Св. Яна Евангеліста
– Плешчаніцы – Св. Ганны
– Сцешыцы – Перамянення Пана
– Юркавічы – Св. Яна Хрысціцеля

**03.06 - 30.06.2017 — Мядзельскі дэканат** (адказны – кс. Багуслаў Маджэеўскі)
– Засвір – Найсвяцейшай Тройцы
– Канстанцінава – Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі
– Крывічы – Св. Андрэя, апостала
– Мядзел – Маці Божай Шкаплернай
– Нарач – Св. Андрэя, апостала
– Свір – Св. Мікалая, біскупа
– Шэметава – Маці Божай Нястомнай Дапамогі

**30.06–03.07.2017 – Нацыянальны санктуарый Маці Божай у Будславе** (адказны – а. Віктар Бурлака OFM)

**03.07–12.10.2017 – іншыя дыяцэзіі Беларусі**
Заканчэнне перэгрынацыі.

**13.10–15.10.2017 – мінская архікатэдра Імя Найсвяцейшай Панны Марыі**

*Паводле Catholic.by*



# У МЕЖАХ ГОДА МІЛАСЭРНАСЦІ АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА КАТЭХЕТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ МІНСКАГА ТЭАЛАГІЧНАГА КАЛЕДЖА

*22 кастрычніка 2016 г. ў касцёле Св. Сымона і Св. Алены ў Мінску адбылася сустрэча катэхетаў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, а таксама выкладчыкаў і студэнтаў Мінскага тэалагічнага каледжа імя Св. Яна Хрысціцеля ў межах святкавання Юбілейнага Года Міласэрнасці*

Ксёндз Ян Крэміс, дырэктар тэалагічнага каледжа, распачаў сустрэчу з малітвы і звярнуўся да ўдзельнікаў з прывітальнымі словамі. Святар адзначыў, што Год Божай Міласэрнасці ўжо завяршаецца і гэтая сустрэча з'яўляецца своеасаблівым падсумаваннем таго, што адбылося за гэты год у Касцёле, у каледжы і ў асабістым жыцці.

«Спалучэнне любові і справядлівасці – гэта Божая міласэрнасць. Яна актуальная не толькі на працягу гэтага года, калі мы асаблівым чынам ушаноўваем Божую міласэрнасць, але гэтая тэма будзе прысутнай і праз усё наша жыццё», – сказаў кс. Ян Крэміс.

Пасля сястра Канстанцыя прадставіла ўдзельнікам сустрэчы даклад, у якім ішла гаворка пра Божую міласэрнасць і сённяшні час. «Усё жыццё Езуса Хрыста было актам міласэрнасці ў адносінах да чалавека. І на крыжы Езус паказаў вяршыню міласэрнасці, вяршыню любові. На крыжы Божая міласэрнасць перамагла справядлівасць, таму што па справядлівасці мы не павінны былі быць збаўлены», – адзначыла манахіня.

«Чалавек год за годам аддаляўся ад Бога і пачаў будаваць свет без Яго. І зноў Божая міласэрнасць працякае ў чалавека. Езус нанова прыгадвае аб міласэрнай любові праз сястру Фаўстыну Кавальскую і кажа ёй такія словы: "Гавары ўсяму свету аб Маёй міласэрнасці. З усіх Маіх Ран, як з крыніцы, струменіць міласэрнасць для душаў, але Рана Майго Сэрца з'яўляецца крыніцай бяздоннай міласэрнасці, з гэтай крыніцы струменяць усялякія ласкі для душаў"», – дадала дакладчыца.

Сястра Канстанцыя распавяла пра тое, што місіяй сястры Фаўстыны Кавальскай была падрыхтоўка свету да другога прыйсця Хрыста, паводле словаў, з якімі да святой звярнулася Панна Марыя.

Кажучы пра Божую міласэрнасць і сучаснага чалавека, якому міласэрнасць часам «перашкаджае», сястра адзначыла: «Бог з'яўляецца не толькі Любоўю, але і Праўдай. І ў сваёй бязмежнай міласэрнасці прыходзіць да нас не для таго, каб вучыць нас праўдзе аб рэальнасці, адкрыць вочы, каб бачыць, і мужнасць, каб разумець». «Толькі чалавек, адкрыты на Любоў Бога і пакладаючы надзею на Яго міласэрнасць, будзе мець мужнасць жыць такімі неўміручымі каштоўнасцямі, як праўда, любоў, адказнасць, павага і прабачэнне», – заўважыла дакладчыца.



Напрыканцы ўзяла слова сястра Часлава, якая заахвоціла катэхетаў, каб, праходзячы ў межах сустрэчы праз Брамы Божай Міласэрнасці, на першае месца ў сваіх інтэнцыях яны ставілі тых дзяцей, да якіх яны былі пасланы са сваёй місіяй навучання. «Трэба ўнесці іх на сваіх руках праз Брамы Міласэрнасці і ахвяраваць гэты дзень у іх інтэнцыі», – сказала манахіня.

Пасля катэхеты, выкладчыкі і студэнты каледжа вырушылі ў невялікую пілігрымку да Брамаў Божай Міласэрнасці, якія знаходзяцца ў мінскім архікатэдральным касцёле. Як таксама прапанавала сястра Часлава, пілігрымку яны здзейснілі ў цішыні і засяроджанасці.

*Працяг на стар.8*

# У МЕЖАХ ГОДА МІЛАСЭРНАСЦІ АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА КАТЭХЕТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ МІНСКАГА ТЭАЛАГІЧНАГА КАЛЕДЖА

*Заканчэнне. Пачатак на стар. 7*

Каля катэдры іх сустрэў кс. Ян Крэміс. Атрымаўшы ад яго благаслаўленне, усе разам прайшлі праз Брамы Божай Міласэрнасці. У катэдры ўдзельнікі сустрэчы памаліліся Вяночак да Божай Міласэрнасці і Літанію да Божай Міласэрнасці, а пасля прынялі ўдзел у святой Імшы, якую ўзначаліў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

«Катэхізацыя сёння стала неад'емнай часткай жыцця і дзейнасці Касцёла ў Беларусі, у тым ліку ў Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, – адзначыў арцыбіскуп у гаміліі. – Хаця адчуваецца патрэба ў яе ўдасканаленні, што пацвярджаюць пастырскія візітацыі. Таму сённяшняе святкаванне Юбілею катэхетаў, навучэнцаў і выкладчыкаў Мінскага тэалагічнага каледжа ў межах Надзвычайнага Года Божай Міласэрнасці, найперш неабходна ўспрымаць як знак падзякі міласэрнаму Богу за дадзеную магчымасць арганізавана і паводле апрацаванай праграмы ажыццяўляць катэхізацыю. Гэта адпаведны час зрабіць рахунак сумлення, ці належным чынам былі выкарыстаны новыя магчымасці. Гэта таксама добрая нагода зрабіць новыя пастановы згодна з патрабаваннямі часу і яго выклікамі».





«Новая сітуацыя свабоды веравызнання і нармальнай катэхізацыі – гэта не што іншае, як праяўленне бязмежнай Божай міласэрнасці. Гэта дар і адначасова заданне», – заўважыў іерарх.

«Сёння, дзякуючы за дар магчымасці свабодна катэхізаваць, будзем годнымі гэтага дару, выкарыстаем належным чынам і зробім адпаведныя планы на будучыню, – дадаў Мітрапаліт. – Няхай залогам поспеху ў гэтых пажаданнях будуць словы Вялікага Пантыфіка: "Ідзіце і катэхізуйце", каб цягнік з патрабуючымі катэхізацыі не ад'ехаў без нас».

*Таццяна Грамыка*
*Паводле Catholic.by*

# МЯДОВЫ ВЕРНІСАЖ

*У нядзелю, 16 кастрычніка 2016 г., ў Чырвоным касцёле ладзіўся мядовы вернісаж пад назвай “Пчалінае ўзнясенне”. Было выстаўлена больш за 30 карцін вядомага беларускага мастака Алеся Кваткоўскога на тэму пчолы і мёд*

Як сказаў на адкрыцці выставы сам аўтар, творчая праца над калекцыяй жывапісных карцін на «пчаліную» ці «мядовую» тэму пачалася з верша Анатоля Сыса «Начаваў я ў вуллі». Усе сюжэты карцін узяты з асабістага жыцця мастака, яго родных і сяброў. Цікавасць да пчол была ў Алеса Квяткоўскага з малых гадоў – усё маленства праходзіла з лета ў лета ў бабулі і дзядзькі Аркадзя пад Капылём. Вуллі, пчолы, пакой перад верандай у сад, дзе захоўваліся прылады, патрэбныя для пчалярства – пакой нібыта насычаны мядовым пахам і водарам – усё гэта назаўжды.



З часам цікавасць да звычайнай пчалінай тэмы перарасла ў Алеся Квяткоўскага ў клопат і пошук развіцця іншых тэм, напрыклад «Борці», «Соты», «Калода»,«Рой». І асаблівае месца ў творчасці мастака займае хрысціянская тэма – творы «Мядовы Спас», «Найсалодшая», «Пчолы над Іерусалімам» і многія іншыя. Сярод умоўна-абстрактных кампазіцый асаблівае ўражанне аказваюць вобразы Ісуса Хрыста і Маці Божай.

Сюжэты многіх карцін падказалі вершы лепшага сябра паэта Віктара Шніпа, у тым ліку «Пчолы – гэта душы анёлаў».

Мастак выразіў удзячнасць пробашчу касцёла Святога Сымона і Святой Алены Уладыславу Завальнюку і куратару бібліятэкі Галіне Івуць за арганізацыю выставы сваіх работ.

Ад імя пчаляроў слова меў загадчык лабараторыі пчалаводства Акадэміі навук Дзмітрый Рахматулін, які падзякаваў аўтару і арганізатарам выставы за падтрымку развіцця пчалаводства на духоўным і мастацкім узроўні.

Свае вершы прачытаў паэт Віктар Шніп. «Вялікае княства Літоўскае стварылі тутэйшыя пчолы. Якія збіраючы мёд, як кроплі сонца, гулі паміж сабою на беларускай мове і пра Францыска Скарыну, які,перетварыўшы пчол у літары, надрукаваў Біблію. І сёння там, дзе пчолы, там наша вялікае княства». Паэт падараваў бібліятэцы імя Адама Міцкевіча касцёла кнігу вершаў з надпісам: «Вернікам і чытачам бібліятэкі Чырвонага касцёла, у якім светла ад малітваў, ад анёлаў, якія тут жывуць».

Калі гаварыць пра вернісаж ў цэлым, то белая зала Чырвонага касцёла, дзе размясцілася выстава, у гэты самотны час позняй восені літаральна напоўнілася чыстымі сочечна-мядовымі фарбамі, летнім цяплом ліпеня і жніўня, пахам ліпы і чабору.

Упрыгожыла вернісаж і выступленне хору Чырвонага касцёла «Голас душы» пад кіраўніцтвам Таццяны Гажэўскай.

У канцы ўсе ўдзельнікі і наведвальнікі пачаставаліся гарбатай з мёдам.

Выстава «Пчалінае ўзнясенне будзе працаваць да 20 снежня 2016 года.



*Ванда Іваноўская,*
*бібліятэкар бібліятэкі імя Адама Міцкевіча*

# «БОГ НЕ ЗАСЯРОДЖВАЕЦЦА НА НАШЫХ ГРАХАХ, АЛЕ ПЕРААДОЛЬВАЕ ІХ ЛЮБОЎЮ»

*Глядзець на чалавека вачыма Бога заклікаў Папа Францішак у сваім разважанні перад малітвай «Анёл Панскі» на плошчы Св. Пятра 30 кастрычніка 2016 г.*

«Сённяшняе Евангелле расказвае нам пра падзею, якая адбылася ў Ерыхоне, калі Езус прыйшоў у горад і Яго прывіталі натоўпы народу (Лк 19, 1-10). У Ерыхоне жыў Закхей, кіраўнік “мытнікаў”, гэта значыць зборшчыкаў падаткаў. Закхей быў багатым чалавекам і супрацоўнікам ненавісных рымскіх акупантаў, эксплуататарам свайго народа. Таксама і ён, з цікавасці, хацеў убачыць Езуса, але яго стан публічнага грэшніка не дазваляў яму наблізіцца да Настаўніка. Больш за тое, ён быў малога росту і таму залез на дрэва, смакоўніцу пры дарозе, па якой павінен быў праходзіць Езус.

Калі Езус наблізіўся да гэтага дрэва, глянуў уверх і сказаў яму: “Закхей, хутчэй спускайся, бо сёння Мне трэба быць у тваім доме” (Лк 19, 5). Мы можам сабе ўявіць здзіўленне Закхея! Але чаму Езус кажа: “сёння Мне трэба быць у тваім доме”? Пра які абавязак тут ідзе гаворка? Мы ведаем, што найвышэйшым абавязкам Хрыста з'яўляецца ажыццяўленне плану Айца адносна ўсяго чалавецтва, што выконваецца ў Ерузалеме, са смяротным прысудам на Яго, калі быў укрыжаваны і на трэці дзень уваскрос. Гэта план збаўлення, міласэрнасці Айца. І ў гэтым плане знаходзіцца і збаўленне Закхея, чалавека несумленнага і пагарджанага ўсімі, які меў патрэбу ў навяртанні. Евангелле кажа, што калі яго Езус клікаў, усе “пачалі наракаць” і казалі, што “Ён зайшоў пагасціць да грэшнага чалавека” (Лк 19, 7). Народ бачыў у ім эксплуататара, які стаў багатым дзеля выкарыстоўвання іншых. Але калі б Езус сказаў: “Спускайся, ты злачынца, здраднік народа, і прыйдзі пагаварыць са Мной, каб разлічыцца!” – тады, напэўна, народ апладзіраваў бы Яму. Але тут яны пачынаюць наракаць: “Езус ідзе ў яго дом, грэшніка, эксплуататара”.

Але Езус, кіраваны міласэрнасцю, шукаў менавіта яго. І калі ўвайшоў у дом Закхея, кажа: “Сёння прыйшло збаўленне ў дом гэты, таму што і ён сын Абрагама. Бо Сын Чалавечы прыйшоў знайсці і выратаваць тое, што загінула” (Лк 19, 9-10). Зрок Езуса перавышае ўсе грахі і апярэджанні. Гэта вельмі важна. Мы павінны гэтаму навучыцца. Зрок Езуса выходзіць за грахі і апярэджанні. Ён бачыць чалавека вачыма Бога, і Яго позірк не затрымліваецца на зле, зробленым у мінулым, але бачыць будучае дабро. Ён не замкнуты, але заўсёды дае новыя прасторы жыцця. Ён глядзіць не на знешні выгляд, але на сэрца. Тут Ён глянуў на параненае сэрца гэтага чалавека, параненае грахом прагнасці, шматлікімі дрэннымі рэчамі, якія зрабіў Закхей. І Ён глядзіць на гэтае параненае сэрца і ідзе да яго.

Часам мы імкнемся выправіць і навярнуць грэшніка, лаячы яго, папракаючы яго за памылкі і несправядлівыя паводзіны. Стаўленне Езуса да Закхея паказвае нам іншы шлях, каб паказаць таму, хто памыляецца, каштоўнасць яго дарогі, тую каштоўнасць, якую Бог пастаянна бачыць, нягледзячы на ўсё, нягледзячы на ўсе яго памылкі. Гэта можа зрабіць станоўчую нечаканасць, якая змякчае сэрца і штурхае чалавека паказаць дабро, якое мае ў сабе. Праява даверу да людзей робіць тое, што яны ўзрастаюць і змяняюцца. Так Бог паводзіць сябе з усімі намі: Ён не засяроджваецца на нашых грахах, але іх перaадольвае любоўю і дае нам адчуць тугу па добраму. Мы ўсе адчулі гэтую тугу па добраму пасля памылкі. І так робіць наш Бог-Айцец, так робіць Езус. Няма ні аднаго чалавека, які не меў бы ў сабе штосьці добрае. І на гэта глядзіць Бог, каб выцягнуць чалавека са зла.

Няхай Панна Марыя дапаможа нам бачыць дабро, прысутнае ў людзях, якіх мы сустракаем кожны дзень, каб усе былі закліканы паказаць звонку вобраз Божы, які ўпісаны ў іх сэрцах. І такім чынам мы можам радавацца нечаканасцям Божай міласэрнасці! Наш Бог, які ёсць Богам нечаканасцяў», – сказаў Папа.

Пасля малітвы «Анёл Панскі» Пантыфік нагадаў, што 29 кастрычніка ў Мадрыдзе была беатыфікавана група бэнэдыктынскіх манахаў, забітых з нянавісці да веры падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі. Гаворка ідзе пра чатырох святароў: а. Хасэ Антона Гомэса, а. Анталіна Пабласа, а. Хуана Рафаэля Марыяна Алькасэра Марцінэса і а. Луіса Эўлогіа Відаўрадзага Гомэса. «Будзем славіць Пана, і даверым Яго заступніцтву нашых братоў і сясцёр, якія, на жаль, нават і сёння ў розных частках свету пераследуюцца за веру ў Хрыста», – сказаў Папа Францішак.

Святы Айцец таксама нагадаў, што на працягу наступных двух дзён здзейсніць апостальскае падарожжа ў Швецыю з нагоды юбілею Рэфармацыі. Папа выказаў надзею, каб гэтае падарожжа стала новым этапам братняй пілігрымкі да поўнага адзінства сярод хрысціян.

На заканчэнне Пантыфік заклікаў вернікаў маліцца за яго і ўдзяліў сабраным на ватыканскай плошчы сваё благаслаўленне

*Паводле беларускай рэдакцыі Ватыканскага радыё*

# СВЯТЫ ХРОСТ

## З радасцю паведамляем, што за апошні час Сакрамант Хросту атрымалі:

***Антаніна Чаркес***, дачка Аляксея і Ганны
***Арсеній Дунай***, сын Мечыслава і Вольгі
***Васіліна Пясецкая***, дачка Уладзіміра і Алены
***Эрнэст (Рэнат) Скараход***, сын Яўгенія і Алены
***Улада Таўгень***, дачка Антона і Ганны
***Ян-Лявон Карэцкі***, сын Дзмітрыя і Аліны
***Максім Палуян***, сын Дзмітрыя і Таццяны
***Вераніка Давыдзенка***, дачка Андрэя і Алены
***Арцём Фоміч***, сын Максіма і Алесі
***Адрыяна-Елізавета Алешко***, дачка Паўла і Веранікі
***Паліна-Ганна Камінская***, дачка Аляксея і Вікторыі
***Лізавета Лях***, дачка Уладзіміра і Марыны
***Аляксандр-Пётр Кручонак***, сын Андрэя і Алесі
***Яўгеній-Павел Кручонак***, сын Андрэя і Алесі
***Варвара-Паўліна Тарас***, дачка Аляксея і Юліі
***Ян Жыцкі***, сын Дзяніса і Юліі
***Арыяна-Паўліна Касоўская***, дачка Андрэя і Тэрэзы
***Дабрыня-Францыск Губар***, сын Ільі і Вікторыі
***Алёна Алешчык***, дачка Паўла і Аляксандры
***Альбіна Сяргей***, дачка Аляксея і Таццяны
***Яраслаў-Міхаіл Маршаловіч***, сын Аляксея і Галіны
***Сафія Мацкевіч***, дачка Яўгена і Марыі
***Ева Нарчук***, дачка Яўгенія і Святланы
***Даніла Літвінаў***, сын Сяргея і Таццяны
***Аляксандра Саўчанка***, дачка Васілія і Любові



# ВІНШУЕМ МАЛАДЫХ

## Давяраем добраму Богу сужэнскае жыццё маладых людзей, якія вырашылі быць заўсёды разам, і просім для іх асаблівага Божага блаславення

Дзяніса Ладысюка і Анжаліку Ладысюк
Паўла Зінкевіча і Ірыну Зінкевіч
Сяргея Ляхоўскага і Дар'ю Зелікаву
Вацлава Вярбіцкага і Ірыну Ярошак
Роберта Пяткевіча і Ганну Савуткіну
Сяргея Меньшыкава і Яўгенію Дзмітровіч
Руслана Макоўскага і Алёну Лісавец
Аляксандра Шымановіча і Ганну Дыско
Вадзіма Дзёмчыка і Марыю Арцюшкіну
Юрыя Мішкаўца і Анну Бруня
Дзмітрыя Франкова і Анастасію Франкову (Сусленкову)
Андрэя Мацэвіча і Таццяну Мацэвіч
Дзмітрыя Бабкевіча і Алену Цацук

**СВЯТАЯ ІМША БУДЗЕ АДСЛУЖАНА**

_______ · _______ *2016 г. у* _______ · _______ *гадзін*

*у інтэнцыі* ________________________________________________

____________________________________________________________

| 14 лістапада Панядзелак | 15 лістапада Аўторак | 16 лістапада Серада | 17 лістапада Чацвер | 18 лістапада Пятніца | 19 лістапада Субота | 20 лістапада Нядзеля |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – * | 7.00 – ✞ | 8.00 – * | 8.00 – * |
| 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞PL | 9.00 – ✞ | 9.00 – * | 9.00 – * |
| 12.00 – ✞ | 12.00 – ✞ | 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 12.00 – * | 12.00 – ✞ | 11.00 – S |
| 15.00– Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00– Вяч | 15.00 – Вяч | 15.00 – Вяч | 13.00 – *PL |
| 17.00 – * | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 17.00 – ✞ | 15.00 – 👪 |
| 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 19.00 – ✞ | 15.00 – Вяч PL |
| | | | | | | 16.00 – * |
| | | | | | | 17.00 – * |
| | | | | | | 19.00 – * |
| | | | | | | 21.00 – * |

* – Святая Імша ў інтэнцыі аб здароўі, Божым блаславенстве, апецы Маці Божай
✞– Святая Імша ў інтэнцыі памерлых
S – Summa – Святая Імша ў інтэнцыі парафіі
PL – Святая Імша на польскай мове
Вяч – Вячыстая Святая Імша за чыстцовыя душы
**скл** – Святая Імша складковая; **мл** – Святая Імша для моладзі; **слых** – Святая Імша для глуханямых

**Вячыстая Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту** — у капліцы Маці Божай Будслаўскай
**15.00** — Вячыстая Святая Імша ля алтара Божай Міласэрнасці ў інтэнцыі памерлых

# АНОНСЫ

## «КАТАЛІЦКІ ПІЛІГРЫМ» АРГАНІЗУЕ ДЗВЕ ПІЛІГРЫМКІ Ў ФАЦІМУ Ў ЛІПЕНІ 2017 ГОДА

Духоўнае падарожжа ў Фаціму (Партугалія), дзе ў 1917 годзе адбываліся аб'яўленні Маці Божай тром дзецям, з нагоды 100-годдзя гэтых падзей у ліпені 2017 года арганізоўвае бюро «Каталіцкі пілігрым» пры епіскапаце Беларусі.

**Беларусь-Фаціма**

Першая пілігрымка (аўтобусная) акрамя партугальскай Фацімы будзе ўключаць у сябе знаёмтсва з санктуарыямі ў французскім Лурдзе і Ла-Салет, а таксама іспанскім Санц'яга-дэ-Кампастэла. Падарожжа адбудзецца 5-23 ліпеня і будзе пралягаць праз Чэхію, Швейцарыю, Германію і Польшчу.

Другая пілігрымка (самалётам) адбудзецца 8-15 ліпеня і будзе прысвечана знаёмству беларускіх вернікаў выключна са святымі месцамі Партугаліі.

Як распавёў адказны за арганізацыю падарожжаў кс. Раман Факсінскі, цэнтральныя ўрачыстасці абедзвюх пілігрымак пройдуць 13 ліпеня 2017 года з удзелам Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча.

Паводле слоў кс. Рамана Факсінскага, гэта дата абраная невыпадкова, бо менавіта ў гэты дзень стагоддзе таму Маці Божая перадала сваё пасланне адносна Расіі, у склад якой на той час уваходзілі і землі Беларусі.

Запіс на пілігрымкі ўжо адкрыты на сайце «Каталіцкага пілігрыма».

**Гісторыя Фацімы**

Паміж 13 мая і 13 кастрычніка 1917 г. у Кова да Ірыя ў парафіі ў Фаціме Маці Божая шэсць разоў аб'явілася траім пастушкам з Фацімы – Франсішку і Жасінце Марту і Лусіі Сантуш.

Маці Божая заахвочвала дзяцей да пакаяння за душы ў чыстцы, да штодзённай малітвы Ружанца аб наяртанні грэшнікаў і да малітвы за мір, а таксама прасіла пабудаваць у гэтым месцы капліцу ў Яе гонар.

Каталіцкі Касцёл прызнаў аб'яўленні цудам 13 кастрычніка 1930 г. А 31 кастрычніка 1942 г., згодна з просьбай Маці Божай, Папа Пій XII прысвяціў свет Беззаганнаму Сэрцу Марыі. На сёння ў Фаціме знаходзяцца сядзібы 47 жаночых манаскіх супольнасцяў і 15 мужчынскіх. Кожны год у Фаціму прыбываюць больш за 5 мільёнаў пілігрымаў з усіх частак свету.

*Паводле Catholic.by*

Голас душы № 10 (535) 2016. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1188. Выдадзена міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня 2016 г.
Заснавальнік: грамадскае аб'яднанне "Хрысціянскае таварыства міласэрднасці". Выдаецца з верасня 2000 г. на беларускай, рускай, лацінскай і польскай мовах.
Галоўны рэдактар – Кс. Уладыслаў Завальнюк, адказны рэдактар – Наталля Лаўрэнка, тэхнічны рэдактар – Кацярына Качарго.
Падпісны індэкс: 63135.Свабодны кошт.
Адрас рэдакцыі: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 15. Тэл.: (017) 200-44-15, (017) 200-56-32. Факс: (017) 200-55-61, E-mail: vlad_za@tut.by
www.chyrvony.by. Падпісана да друку 11.11.2016. Фармат 60×84 1/8. Надрукавана СТАА "Эвалайн", вул. Рыбалка, 9, оф. 23, 220033 г. Мінск.